ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
“ПЕТКАВІЦКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА”

# “РАСКАЗВАННЕ КАЗКІ “ЛЁГКІ ХЛЕБ”

Канспект занятку па адукацыйнай галіне «Мастацкая літаратура»
ў старэйшай групе (5-6 год)

Аўтар:
Сохіна В.Н., выхавальнік дашкольнай адукацыі

аг. Петкавічы

Праграмныя задачы: паглыбляць уяўленні дзяцей пра жанравыя асаблівасці казкі; фарміраваць уменне даваць адзнаку дзеянням персанажаў казкі; развіваць уменне пераказваць казку; ствараць выказванні, якія характарызуюцца самастойнасцю, закончанасцю, лагічнай сувяззю паміж сваімі часткамі і моўным афармленнем; развіваць пазнавальныя і моўныя здольнасці; выхоўваць эмацыянальна-пазітыўныя адносіны да твораў фальклору.

Абсталяванне: карткі да гульні “Што за чым?”, аўдыязапісы з голасам “хлеба” і галасамі жывёл, мнематабліца да казкі.

Ход занятку

1. Сюрпрызны момант

Выхавальнік: Хлопчыкі і дзяўчынкі, сёння ў нас з вамі незвычайны госць. Ён крышачку хвалюецца, і таму схаваўся пад ручніком (на падносе пад ручніком ляжыць хлеб). Паслухайце загадку і паспрабуйце адгадаць, хто ж там схаваўся:

Мнуць і катаюць,

У печцы закаляюць,

А потым за сталом

Рэжуць нажом. (Хлеб)

В: Так, гэта хлеб. Але хлеб не звычайны, а чарадзейны, казачны, таму што ён умее размаўляць. Зараз, калі ласка, паслухайце, што ён хоча нам сказаць. (Уключаецца аўдыязапіс быццам бы з голасам хлеба)

Хлеб: Прывітанне, хлопчыкі і дзяўчынкі. Я прыйшоў да вас за дапамогай. Я згубіўся і не магу ўспомніць дарогу дадому, бо злая Баба Яга мяне зачаравала і сказала, што я змагу знайсці дарогу дадому, у сваю казку, толькі тады, калі хто-небудзь нагадае мне яе назву і перакажа сваімі словамі, а не проста прачытае. Дапамажыце мне, калі ласка, вярнуцца дадому, ў маю казку.

2. Асноўная частка

В: Ну што дапаможам хлебу вярнуцца дадому? (Адказы дзяцей)

В: Якую сказку мы ведаем, дзе размова ідзе пра хлеб. (Адказы дзяцей)

В: Так, правільна, казка называецца “Лёгкі хлеб”. Адно заданне мы выканалі: назвалі казку, з якой прыйшоў хлеб. Засталося яе пераказаць, а для гэтага давайце я вам яе спачатку прачытаю, а вы ўважліва слухайце, каб потым пераказаць.

(Выхавальнік чытае казку)

В: Што ж вы ўважліва слухалі казку і зможаце адказаць на мае пытанні.

Адказы на пытанні

Што я вам прачытала? (Адказы дзяцей)

Чаму гэты твор мы можам лічыць казкай? (Адказы дзяцей)

Хто галоўныя героі казкі? (Адказы дзяцей)

Што рабіў касец? (Адказы дзяцей)

Што хацеў паспрабаваць воўк? (Адказы дзяцей)

Ці спадабаўся ваўку хлеб? (Адказы дзяцей)

Аб чым ён папрасіў чалавека? (Адказы дзяцей)

А зараз давайце разам раскажам, як трэба хлеб даставаць.

Дыдактычная гульня “Раскладзі па парадку”

На стале ляжаць пераблытаныя карткі, на якіх адлюстраваны розныя этапы вырабу хлеба. Дзецям неабходна разлажыць малюнкі ў правільнай паслядоўнасці і расказаць, як здабываюць хлеб.

В: А зараз давайце працягнем адказваць на пытанні. Калі воўк пачуў, як цяжка здабываць хлеб, аб чым ён папрасіў касца. (Адказы дзяцей)

В: Куды адправіў ваўка касец? (Адказы дзяцей)

В: Успомніць, каго спрабаваў з’есці воўк, нам дапаможа **гульня** “Адгадай па голасе” (Уключаецца аўдыязапіс з галасамі каня, гусей і барана**.** Дзеці слухаюць і адгадваюць, каго сустракаў воўк на сваім шляху і спрабаваў з’есці)

В: Ці бывае хлеб лёгкі на самой справе? (Адказы дзяцей)

В: А зараз давайце адпачнём

Фізкультхвілінка «Каравай»

У зямлю зернейка пасадзім - (Нахілы наперад)

Вельмі малое яно. (Прысесці)

Але, як сонейка засвеціць, (Рукі падняць уверх)

Прарасце маё зярно. (Паступовае ўставанне)

Вецер хмарку прыгнаў (Нахілы направа - налева, рукі уверсе)

І нам дожджыку даў. (Махі рукамі)

Сажне касец збожжа (Павароты направа - налева, імітуючы касьбу)

І размеле яго. (Кулак на кулак і кругавыя кручэнні)

А гаспадыня з мукі (Імітацыя - пячэм піражкі)

Спячэ нам піражкі.

І вялікі каравай (Злучыць рукі)

Ўсім на радасць раздавай! (Развесці рукі ў стораны).

В: А зараз давайце пераскажам казку, каб хлеб мог вярнуцца дадому. (Пераказ казкі з апорай на мнематабліцу)

3. Заключная частка

Хлеб: Вялікі дзякуй хлопчыкі і дзяўчынкі. Чары перасталі дзейнічаць, і я ўспомніў дарогу дадому. Жадаю вам усяго лепшага. Да пабачэння!

В.: Дзеці, якую казку мы сёння з вамі ўспомнілі? Хто яе галоўны герой? Ці лёгка дастаецца хлеб? Як трэба да яго ставіцца?

Літаратура

Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі/ М-ва адукацыі Рэсп.Беларусь.- Мінск:НІА, 2023.- 367 с.